

ПРА «ГЭТА» – ПАДЛЕТКАМ І БАЦЬКАМ

Сямейная газета



ГІСТОРЫЯ НЯБЕСНАЙ МАЛАДОЙ СЯМ'І

Сямейная газета


Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на родной мове

# ЗВЯЗДА

18 КРАСАВІКА 2019 г. ЧАЦВЕР № 73 (28940)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ігар ПЕТРЫШЭНКА, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«У краіне неабходна павышаць якасць работы па прафілактыцы падлеткавай злачыннасці. У апошнія гады сітуацыя тут стабілізавалася. Па выніках першага квартала ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года адзначаецца зніжэнне на 2,6 працэнта злачынстваў, здзейсненых непаўналетнімі. Але, на жаль, у Мінскай і Гомельскай абласцях іх колькасць узрасла. Мы павінны прадметна працаваць з кожным непаўналетнім, каб гэтая статыстыка ўвесь час мела тэндэнцыю да зніжэння і якасць гэтай работы толькі ўзрастала».*

## КОРАТКА

- **Пасля пажару 15 красавіка Нотр-Дам дэ Пары будзе закрыты каля пяцішасці гадоў.**
- 1 млн дрэў плануе пасадзіць ГА «Беларускі экалагічны рух» падчас акцыі «Дрэва пасаджана!».
- **BelToll з 10 чэрвеня да 10 ліпеня вызваліць ад платы за праезд па платных дарогах Беларусі ўладальнікаў ТС з дапушчальнай агульнай масай, не большай за 3,5 тоны з прычэпамі.**



- «Гомельшкло» будзе выпрацоўваць шматфункцыянальнае шкло з нанясеннем да 15 слаёў розных пакрыццяў без зніжэння празрыстасці.
- **У Гомелі затрымалі 21-гадовую мясцовую жыхарку, якая скрала ў сваёй бабулі $8,8 тыс.**


ISSN 1990 - 763X


# НА ЛЯСНОЙ ПРАЦЫ



Уладзімір ГУРСКІ (на фота справа) і Іван УРУБЛЕЎСКІ — землякі, аднавяскоўцы, нават суседзі. Жывуць яны ў вёсцы Ацмінава Навагрудскага раёна. Паколькі гэтая вёска — лясная, то і праца ў іх таксама звязана з лесам. Уладзімір і Іван шмат гадоў аддана служаць леснікамі, іхнія сцежкі-дарогі і ў лесе часта перасякаюцца.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

Разумныя грошы

## КАБ НЕ ВАЗІЦЬ ГРОШЫ Ў ВАЛІЗЦЫ

### Як зберагчы ўласныя фінансы ў падарожжы

**Калі вы праспалі ранейшае браніраванне ў пачатку вясны, тады «пуцёўкі, якія гараць» — ваша ўсё. Толькі памятайце, што неад'емным аксесуарам вандроўкі сёння з'яўляецца плацежная картка, якая пазбавіць вас ад неабходнасці дэклараваць наяўныя пры перасячэнні мяжы і выключыць рызыку кішэнных крадзяжоў. Акрамя таго, апошнім часам стала модна мець пры сабе як мага менш наяўных. А многія нават робяць для паездак асобную картку.**

### Якую? Вось у чым пытанне

У прынцыпе, працаваць будзе любая пластыкавая міжнародная банкаўская карта, з дапамогай якой можна расплачвацца ў інтэрнэце і ў рэале. Яна вам патрэбна для браніравання білетаў і гатэляў, а таксама для аплаты ў крамах і зняцця наяўных. Такім чынам, вам падыдзе картка Visa і MasterCard любога банка, акрамя пластыку тыпу БЕЛКАРТ, якія служаць для выкарыстання толькі ў нашай краіне.

Але, калі вы падарожнічаеце не раз у дзесяць гадоў, то мае сэнс зрабіць імянную карту з чыпам, каб ужо напэўна працавала ўсюды. Вам за вочы хопіць Visa Classic / MasterCard Standart, вышэй ужо не трэба. Як варыянт, падыдуць і Visa Electron / Maestro, але часам па іх аплата не праходзіць у інтэрнэце.

СТАР. 4

Пасля «Вялікай размовы»

## КАШТОЎНАСЦІ ПАД ПАГРОЗАЙ

**На тэрыторыі Магілёўскай вобласці шмат цікавых архітэктурных помнікаў, якія маюць для Беларусі вялікую гістарычна-культурную каштоўнасць. На жаль, яны не ў самым лепшым стане і працягваюць разбурацца. Падчас правядзення акцыі «Задай пытанне Прэзідэнту» жыхар Магілёва Алег Дзьячкоў звярнуў увагу на касцёл дамініканцаў XVIII стагоддзя ў аграгарадку Княжыцы і старажытныя будынкі па вуліцы Лазарэнкі (былой Віленскай) у Магілёве.**

СТАР. 13



Фота Алега ДЗЬЯЧКОВА.

Княжыцкі касцёл просіць дапамогі.